# Журналістыка

А. Ф. МЯСНІКОЎ

## ДРУК БЕЛАРУСІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ПАСКАРЭННЕ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Абнаўленне, яркія праяўленні навізны, унесеныя ў наша жыццё XXVII з'ездам КПСС і XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыяй, адчуваюцца зараз паўсюдна. Абнаўляецца і дзейнасць савецкага друку. У Рэзалюцыі XXVII з'езда КПСС па Палітычнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта партыі падкрэслівалася: «Работа сродкаў масавай інфармацыі тым больш плённая, чым больш у ёй удумлівасці, аператыўнасці і менш пагоні за выпадковым, сенсацыйным»[1]. Да асвятлення пытанняў і праблем паскарэння гэты вывад мае самыя непасрэдныя адносіны. Трэба дабіцца, адзначалася на адной з сустрэч у ЦК КПСС з кіраўнікамі СМІП, каб друк дакладна, настойліва, цвёрда і ўсебакова адлюстроўваў творчую ініцыятыву людзей, накіраваную на вырашэнне нашых стратэгічных праблем і штодзённых задач [2].

Сур'ёзная размова аб ролі і месцы СМІП у жыватворным працэсе перабудовы пачалася на III пленуме Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, які адбыўся ў ліпені 1986 года. Удзельнікі яго канстатавалі: нямала яшчэ ёсць публікацый і перадач, якія яўна не ўлічваюць асаблівасці перыяду, застаюцца ў палоне штампаў і трафарэтаў. Папрок быў зроблены «Звяздзе» і «Магілёўскай праўдзе»: у патоку самасправаздач, слоўнай траскатні тут танулі баязлівыя спробы крытычнага аналізу грамадска значымых праблем. Указвалася таксама, што ў матэрыялах прэсы часам вельмі вузка трактавалася стратэгія паскарэння. Яна зводзілася толькі да росту тэмпаў і аб'ёмаў без глыбокага пранікнення ў якасць і цану росту, у праблемы інтэнсіфікацыі, навукова-тэхнічнага прагрэсу. У многіх раённых і гарадскіх газетах чытач не знаходзіў нават выйсця на актуальныя пытанні, а крытыка не ішла далей асобных, малазначных уколаў па прыватных справах. У сенненскай раённай газеце «Ленінская іскра», у рэчыцкай аб'яднанай «Дняпровец» месяцамі не з'яўляліся крытычныя матэрыялы. «Відаць, Сенненскі райком, Рэчыцкія гарком і райком партыі, — рабіўся вывад на пленуме ЦК КПБ, — як і некаторыя іншыя партыйныя камітэты, не бачаць у друкаваных органах інструменту стварэння, выказніка партыйнага пункту гледжання, баявога памочніка ў арганізацыі і выхаванні мас. Такі падыход трэба мяняць»[3].

Прынцыповы, па-партыйнаму аб'ектыўны разбор пралікаў у дзейнасці газет, тэлебачання і радыёвяшчання быў прадоўжаны на VII з'ездзе Саюза журналістаў БССР у студзені 1987 года. Адзначыўшы пэўнае расшырэнне і нязначнае паглыбленне праблематыкі публіцыстычных выступленняў, першапачатковае зацвярджэнне больш патрабавальнага падыходу да розных з'яў і фактаў рэальнасці, невялікае павышэнне дзейнасці выступленняў СМІП, дэлегаты з'езда прыйшлі да адзінай думкі, што зрухі ў перабудове самой журналісцкай дзейнасці толькі намячаюцца. Нячаста сустракаліся яшчэ выступленні, якія радавалі б глыбокай думкай, сучаснай вастрынёй ацэнкі фактаў, змястоўнасцю і падачай. Па-ранейшаму ў пашане былі ілюстрацыйнасць, апісальніцтва, пераказ пачутага, выбар выпадковых тэм [4].

Якраз у той час Акадэмія грамадскіх навук пры ЦК КПСС правяла ў Беларусі сацыялагічнае даследаванне дзейнасці мясцовага друку. Даныя

аказаліся нярадасныя. Толькі шэсць працэнтаў публікацый прысвячаліся ўдзелу працоўных у кіраўніцтве вытворчасцю, два працэнты — арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Толькі кожнае сёмае выступленне па пытаннях эканомікі закранала ролю чалавечага фактару. Лічбы і працэнты засланялі чалавека-працаўніка — галоўнага стваральніка матэрыяльных даброт. І практычна зусім не пісалі газеты аб партыйным уздзеянні на становішча спраў у народнагаспадарчым комплексе рэспублікі, ад выпадку да выпадку закраналі дзейнасць прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

А быў жа ўжо і першы, так неабходны для іншых вопыт работы ў новых умовах гаспадарання, пераходу на гаспадарчы разлік, самафінансаванне і самаакупнасць. У шэрагу калектываў умацоўвалася дысцыпліна, паспяхова працавалі многія брыгады, змены і ўчасткі. Іх набыткі і дасягненні, гэтак жа як і нявырашаныя пакуль што пытанні і праблемы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця, неабходна было паказаць і прапагандаваць шырока, выкарыстоўваючы самыя розныя формы і метады дзейнасці СМІП.

Адной з такіх важных публікацый з'явілася выступленне ў газеце «Советская Белоруссия» сакратара партыйнага камітэта саўгаса «Ваўкавыскі» Е. Аўгусціновіч «Партком і перабудова»[5]. У складанай сітуацыі, характэрнай для многіх іншых гаспадарак рэспублікі, апынуўся саўгас. Гады застою адмоўна ўздзейнічалі на ўсе бакі жыцця калектыву. Часовая выгода, адсунуўшая на другі план работу з разлікам на перспектыву, прывяла гаспадарку да эканамічнага заняпаду. Пахіснуўся маральна-псіхалагічны клімат, паслабіліся дысцыпліна і актыўнасць людзей. Фармалізм і бюракратызм заглушылі грамадскае жыццё.

І толькі перамены, якія пачаліся ў краіне, дазволілі працаўнікам саўгаса акрыяць, упэўнена паглядзець у заўтрашні дзень. Асновай сваёй штодзённай дзейнасці партыйны камітэт абраў лінію на развіццё і падтрымку ініцыятывы працоўных, рэалізацыю дакладнай і канкрэтнай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця. І гэта прынесла плён: вырасла рэнтабельнасць, павысілася ўраджайнасць, палепшыўся дабрабыт вяскоўцаў.

Праз некалькі дзён пасля публікацыі ў рэспубліканскім друку з'явілася пастанова ЦК КП Беларусі «Аб артыкуле «Партком і перабудова», апублікаваным у газеце «Советская Белоруссия» 8 снежня 1987 года»[6]. Адзначыўшы, што партком саўгаса «Ваўкавыскі» вядзе актыўны пошук шляхоў вырашэння новых задач, а партыйная арганізацыя канцэнтруе ўвагу на ўкараненні гасразліку, выхаванні ў працаўнікоў свядомых адносін да працы і грамадзянскага абавязку, ЦК КПБ рэкамендаваў сельскім партыйным камітэтам і арганізацыям рэспублікі выкарыстаць вопыт парткома саўгаса ў практычнай дзейнасці. Канкрэтныя задачы вызначаліся і перад сродкамі масавай інфармацыі і прапаганды: «Актыўней падтрымліваць парасткі вопыту партыйных камітэтаў і арганізацый па перабудове сваёй дзейнасці. Настойліва дапамагаць ім глыбей асэнсоўваць праблемы, вылучаемыя жыццём, паказваць шляхі іх вырашэння. Весці бескампрамісную барацьбу з кансерватызмам, самазадаволенасцю, якія яшчэ даюць аб сабе знаць у некаторых партыйных арганізацыях».

Да пашырэння тэматыкі выступленняў, паглыблення ў працэсы, што адбываюцца ў рэспубліканскай партыйнай арганізацыі, заклікала друкаваныя органы Бюро Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, якое ў канцы 1988 года разгледзела пытанне аб рабоце партыйнай арганізацыі і рэдакцыйнай калегіі газеты «Звязда» па выхаванню ў журналістаў высокай асабістай адказнасці за канструктыўнасць, праўдзівасць і дзейснасць публікацый. Адзначалася, што газета актыўна ўключылася ў работу па асвятленню наспеўшых пытанняў перабудовы. Узрасла яе папулярнасць, колькасць падпісчыкаў за апошнія тры гады павялічылася на 27 %. Узбагацілася рэдакцыйная пошта [7].

«Разам з тым, — адзначалася на пасяджэнні Бюро ЦК КПБ, — партыйнае бюро, рэдкалегія газеты, маючы немалы творчы патэнцыял, пакуль што не забяспечылі карэннага паляпшэння работы з кадрамі журналістаў. У рэдакцыі адсутнічае сістэма павышэння іх ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню і прафесійнага майстэрства, выхавання ў духу сучаснай палітычнай і маральнай культуры, высокай партыйнай і грамадзянскай адказнасці за даручаную справу». Адзначалася таксама прыніжаная патрабавальнасць да якасці матэрыялаў, ранейшая аднабаковасць і павярхоўнасць у адлюстраванні складаных працэсаў перабудовы розных бакоў грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця. Прызнаўшы работу партыйнай арганізацыі і рэдкалегіі «Звязды» недастатковай, Бюро ЦК КПБ патрабавала ад іх за-

бяспечыць далейшае паляпшэнне падбору і расстаноўкі журналісцкіх кадраў, выхавання іх у духу высокай адказнасці за канструктыўнасць, праўдзівасць і дзейснасць публікацый. Быў вызначаны шэраг мер, накіраваных на павышэнне ідэйна-палітычнага ўзроўню СМІП рэспублікі.

XXVII з'езд КПСС, XIX Усесаюзная партыйная канферэнцыя патрабавалі ад сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды пераходу на новы якасны ўзровень работы. Што гэта азначае на практыцы? На адной з сустрэч у ЦК КПСС з работнікамі газет, тэлебачання, радыёвяшчання, навукі і культуры ў 1988 годзе падкрэслівалася, што журналістам неабходна рашуча ўзнімаць адказнасць. Крытыка, але канкрэтная і доказная, не прыніжаючая, а лечачая. Прэтэнзіі, але аргументаваныя. Публічнасць, але для ўсіх. Самае шырокае супастаўленне меркаванняў. На пярэдні план павінны выйсці канкрэтнасць, аналітычнасць і глыбіня. Талент і кампетэнтнасць, ініцыятыва і заўзятасць друкаванага слова — усё павінна быць пакладзена на алтар справы.

Але і пасля неаднаразовых установак і ўказанняў ЦК КПСС і Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі па-ранейшаму застаецца шэраг пытанняў і праблем паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця, за распрацоўку якіх рэспубліканскі, абласны, гарадскі і раённы друк так па-сапраўднаму і не ўзяўся. Вельмі мала вострай крытычнай накіраванасці ў распрацоўцы праблем навукова-тэхнічнага прагрэсу, цэласнага развіцця ўсяго народнагаспадарчага комплексу Беларусі, паглыблення і ўдасканалення эканамічнага спаборніцтва... Не спрыяе прэса пераадоленню раўнадушнасці чалавека, не дапамагае натхненню яго, што, несумненна, магло б стаць адным з асноўных напрамкаў актывізацыі чалавечага фактару. А хіба не можа дапамагчы друк тым людзям, якія напачатку проста не ўмеюць працаваць у новых умовах?! На жаль, некаторыя з гэтых пытанняў журналісты «не заўважалі»; другія — лічылі не асноўнымі; трэція «не паддаваліся» ім у выніку недастатковай кампетэнтнасці... Былі і такія праблемы, за якія газетчыкі браліся, але толькі імітавалі, акрэслівалі сваю дзейнасць і зацікаўленасць, а справе нічога не садзейнічалі.

У гэтай сітуацыі вельмі маглі б «спрацаваць» такія формы дзейнасці друку, як рэйды-агляды, пераклічкі працоўных калектываў, нештатныя аддзелы і саветы, прэс-цэнтры і карэспандэнцкія пасты. Менавіта праз іх неабходна журналістам наблізацца да жыцця, даваць як мага больш абагульняючага мясцовага матэрыялу.

Сказаць, што гэтыя правераныя дзесяцігоддзямі формы работы не выкарыстоўваліся зусім, вядома ж, нельга. Але драбнелі газеты, нібы і не бачылі ў народнагаспадарчым комплексе рэспублікі радыкальнай перабудовы, вырашэння ключавых праблем эканомікі шляхам укаранення гаспадарчага разліку, самаакупнасці і самафінансавання. На працягу 1986—1988 гадоў «Звязда», як і раней, прысвячала рэйды-агляды ходу зімоўкі жывёлы, сенакосу, уборкі збожжавых і бульбы, барацьбе з п'янствам і алкагалізмам... Тэмы, безумоўна, патрэбныя, важныя, аднак яны не высвечвалі з'яў у эканамічным жыцці, а толькі канстатавалі факты і сітуацыі. Гэтыя ж недахопы ўласцівы і дзейнасці «Советской Белоруссии», у яшчэ большай меры — «Сельской газете», «Мінскай праўдзе», «Гомельскай праўдзе», большасці раённых газет. За новымі рубрыкамі і «шапкамі» тут па-ранейшаму хаваецца шаблон, схематызм, публікацыі, зробленыя па ўчарашніх мерках і патрабаваннях.

Усё больш і больш знікаюць з газетных старонак такія дзейсныя рубрыкі, як каменціраванне пошты спецыялістамі, вучонымі, партыйнымі, савецкімі, гаспадарчымі, прафсаюзнымі і камсамольскімі работнікамі; эканамічныя лекторыі і універсітэты; публікацыя сацыялістычных абавязацельстваў працоўных падраздзяленняў з наступным рэгулярным кантролем за ходам іх выканання; спецыяльныя палосы сацыялістычнага спаборніцтва... Не падзяляем думкі, што яны зжылі, вычарпалі сябе. Хутчэй за ўсё, не змаглі журналісты вызначыць для сябе дакладнае поле дзейнасці, напоўніць ранейшыя формы і метады работы новым канкрэтным зместам.

Роля і назначэнне сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды сёння — у ажыццяўленні ідэй XXVII з'езда КПСС і XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, барацьбе за іх укараненне на кожным участку нашага жыцця. Чым глыбей і грунтоўней пераўтваральныя працэсы, чым складаней задачы, што вызначае партыя на новых рубяжах перабудовы і паскарэння сацыяльна-эканамічнага жыцця, тым з большай адказнасцю партыйныя органы і друк абавязаны паказваць і аналізаваць узровень і якасць праводзімай

работы, адпаведнасць яе патрабаванням часу. Садзейнічаць перабудове і паскарэнню, абараняць іх, развіваць і рухаць наперад — такая сёння задача дня.

[1] Материалы XXVII съезда Коммунистической партии Советского Союза. М., 1987. С. 119.
[2] Гл.: Правда. 1986. 15 марта.
[3] Звязда. 1986. 30 ліпеня.
[4] Там жа. 1987. 2 лютага.
[5] Гл.: Советская Белоруссия. 1987. 8 декабря.
[6] Там жа. 1987. 13 декабря.
[7] Гл.: Звязда. 1988. 25 лістапада.

Е. Л. БОНДАРАВА

## РАЁННЫ ДРУК І КУЛЬТУРА

Уздым культуры — важнейшая передумова плённасці пераўтварэнняў, што адбываюцца зараз у нашым грамадстве. Вялікая роля ў гэтым працэсе адводзіцца сродкам масавай інфармацыі, у прыватнасці друку. Аднак адносна яго найбольш разгалінаванага звяна — раённых, шматтыражных газет — усталявалася думка: яны не ў стане колькі-небудзь сур'ёзна ўплываць на такую спецыфічную сферу жыцця, як культура, гэта пад сілу перыёдыцы іншага рангу. Такая пазіцыя грунтуецца на недаацэнцы магчымасцей рэгіянальных выданняў, уяўляе сабой спробу апраўдаць заганную практыку, якая сёння назіраецца. З мноства раённых, аб'яднаных (гарадскіх і раённых) газет нашай рэспублікі цяжка выбраць хаця б дзесятак (з улікам нават і сталічнага «Вячэрняга Мінска»), на старонках якіх культура асвятлялася б ва ўсёй шматграннасці яе з'яў, складанасці праблем. На папрок за гэта рэдактары звычайна адказваюць: чаго вы хочаце ад нас, калі і штатным раскладам не прадугледжаны аддзел культуры або хаця б адзін спецыяльнага профілю супрацоўнік... Яно сапраўды так.

Тым не меней самым статусам раённых (а тым болей гарадскіх) газет прадугледжана **ўсебаковае** асвятленне жыцця пэўнага рэгіёна, не абмінаючы і адметныя падзеі больш шырокага маштабу. Чытач раённых і гарадскіх газет павінен атрымліваць рознабаковую інфармацыю, гэтыя выданні абавязаны закранаць, асэнсоўваць стан і праблемы культуры нароўні з эканомікай, сельскай гаспадаркай, прамысловасцю, партыйнай і грамадскай работай. Грамадства моцнае гарманічным спалучэннем усіх бакоў жыццядзейнасці чалавека, недаацэнка значэння аднаго з іх заўсёды адмоўна адбіваецца на яго здольнасці да развіцця, удасканалення.

Вядомы дзеяч савецкай культуры акадэмік Д. С. Ліхачоў, выступаючы на З'ездзе народных дэпутатаў СССР (чэрвень 1989), пераканаўча абгрунтаваў цяжкія вынікі «астаткавага прынцыпу» планавання ў галіне культуры, што панаваў у краіне на працягу дзесяцігоддзяў. Ён адбіўся не толькі на матэрыяльнай базе культуры, але і на адносінах да яе мясцовых улад, партыйных камітэтаў, а ў сваю чаргу і на дзейнасці падначаленых ім выданняў.

Старонкі газет «Сцяг Ільіча» Талачынскага рёна, «За камунізм» Калінкавіцкага і «Зара над Бугам» Брэсцкага, шмат іншых сведчаць, што тэматыку, жанры, нават характар публікацый (пераважна інфармацыйны) амаль не кранулі перамены, якія адбываюцца ў «верхнім эшалоне» СМІП. Па-ранейшаму раёнкі час ад часу пішуць пра святы, фестывалі самадзейнага мастацтва, заняткі гурткоў і вечары адпачынку ў Дамах культуры, перадрукоўваюць заметкі аб з'явах культуры, падрыхтаваныя ТАСС, БелТА, АПН. З гэтай крыніцы рэдакцыі «нізавога» звяна чамусьці амаль не бяруць аналітычныя матэрыялы — рэцэнзіі, агляды. Як названыя газеты, так і многія іншыя больш-менш сістэматычна змяшчаюць інфармацыю пра новыя фільмы (пад рубрыкамі «Кіно», «Экран тыдня», «Месячны экран»). Бярэцца такая інфармацыя звычайна з усесаюзнага бюлетэня «Новые фильмы» або рэспубліканскага «На экранах Беларусі». З яе чытач даведваецца пра стваральнікаў фільма, выканаўцаў роляў, сюжэт, а каб гаворка ішла пра мастацкія вартасці — такое здараецца рэдка. Спробу ацаніць кінатвор зрабіла Т. Краўцова, прапагандуючы на старонках газеты «За камунізм» фільм «Плюмбум або Небяспечная гульня».